*ДАСЛЕДАВАННЕ*
*18 студзеня 2018*

Belarusian Institute for Strategic Studies
biss

Каштоўнасныя трансфармацыі

# АД «ХВОРАГА» ДА «ЗДАРОВАГА» НАЦЫЯНАЛІЗМУ

**Пётр Рудкоўскі**

## АСНОЎНЫЯ ТЭЗІСЫ

*«Мяккая беларусізацыя», што адбываецца на дадзены момант - гэта вынік супадзення дзеянняў трох тыпаў актораў: грамадскіх актывістаў, бізнэсу і ўласна беларускай улады. Матывы дзеянняў у кожнага з іх могуць быць розныя, але эфект тут збежны.*

*Расейска-ўкраінскі канфлікт прыспешыў беларусізацыю, але не ён спарадзіў яго. Перадпасылкі для гэтага працэсу паўсталі цягам мінулай дэкады, а зварот дзяржавы да нацыянальных каштоўнасцяў пачаўся ўжо ў 2011-2012 гг.*

*Лукашэнка персанальна зацікаўлены ў тым, каб ідэя незалежнасці Беларусі стала галоўным імператывам для кожнага грамадзяніна, асабліва для чынавенства. Лаяльнасць да Беларусі – гэта хоць не дастатковая, але неабходная ўмова лаяльнасці да ягонай улады.*

## АСНОЎНЫЯ ПРАГНОЗЫ

*Мала імаверна, што беларусізацыя калі-кольвечы стане для Лукашэнкі самастойнай каштоўнасцю, гзн. нечым большым, чым інструментам дасягнення іншых мэтаў.*

*Мала таксама імаверна, што ідэйны хаўрус з адраджэнскім рухам перутворыцца ў палітычны хаўрус. Не выпадае спадзявацца, што такія палітычныя сілы, як БНФ ці КХП будуць дапушчаны да ўлады.*

*Тым не менш, сам працэс беларусізацыі будзе працягвацца – Лукашэнка і яго атачэнне будуць яго падтрымліваць хаця б з прагматычных меркаванняў; бізнэс, грамадскія актывісты і вялікі адсотак беларускіх грамадзян – з прагматычна-этычных.*

*Прадстаўлены вышэй прагноз можа быць нівеляваны ў двух выпадках: а) з'яўленне рэальнай пагрозы агрэсіі з боку Расеі; б) поступ лібералізацыі, які прывёў бы да ператварэння аўтарытарызму ў форму гібрыднага рэжыму.*

*Значная частка даследаванняў, прадстаўленых у гэтай працы, была праведзена ў межах стыпендыі Think Visegrad Fellowship, што рэалізавалася аўтарам гэтага тэксту ў Цэнтры усходніх даследаванняў (Ośrodek Studiów Wschodnich) у Варшаве ў верасні-кастрычніку 2017 года.*

## ЗМЕСТ

**I. Сімптомы і асноўныя трэнды**.......................................2
Грамадзянская актыўнасць.......................................3
Змена стаўлення рэжыму да нацыянальнага адраджэння.......................................4
**II. Чым абумоўлены і наколькі глыбокія названыя трэнды?**.......................................10
**III. Высновы і прагнозы**.......................................14

## I. Сімптомы і асноўныя трэнды

Пад «беларусізацыяй» будзем тут разумець працэс умацоўвання ў грамадскай свядомасці беларускай нацыянальнай тоеснасці шляхам сцвярджэння значнасці беларускай мовы, а таксама прасоўвання наратыву і сімвалаў, якія падкрэсліваюць гістарычна-культурную самабытнасць беларусаў. Асноўным фокусам даследавання ёсць роля і пазіцыя дзяржавы ў гэтым працэсе, тым не менш, нельга пакінуць па-за ўвагай рознага роду нізавыя ініцыятывы – не толькі каб аддаць даніну грамадзянскай супольнасці, але таксама таму, што дзяржаўную палітыку немагчыма разглядаць у ізаляцыі ад грамадскіх працэсаў.

## Грамадзянская актыўнасць

Прасоўванне беларускасці на ўзроўні нізавых ініцыятаў – гэта працэс, які фактычна бесперапынна трываў цягам усяго перыяду прэзідэнцтва Аляксандра Лукашэнкі. Аднак, дзесь пад канец мінулай дэкады заўважаецца новая якасць гэтых ініцыятыў. Па-першае, **адбылося заангажаванне бізнэсу** ў гэты працэс, спачатку спарадычнае і эксперыментальнае, а з цягам часу – сістэматычнае і з тэндэнцыяй да пашырэння. Гэтае заангажаванне праявілася ў двух формах: часцейшае выкарыстоўванне беларускай мовы ў камерцыйнай рэкламе і спансаванне розных акцый скіраваных на ўмацоўванне і папулярызацыю нацыянальных каштоўнасцяў. На дадзены момант (пачатак 2018 года) на вуліцах і праспектах буйных гарадоў з уражваючай частатой спатыкаюцца білборды з постэрамі рэкламуючымі нацыянальныя каштоўнасці «Смак беларускай мовы», «Маё першае слова», «Родныя даты». Такія кампаніі, як Samsung, Velcom, «Аліварыя», «Лідскае піва» або Асацыяцыя рэкламных арганізацый ужо сталі традыцыйнымі спонсарамі розных мерапрыемстваў, скіраваных на прамоцыю беларускасці, а да іх ліку ўвесь час далучаюцца новыя.

Па-другое, паўсталі асяродкі і кампаніі новай генерацыі, чый стыль і тактыка прасоўвання беларускасці значна адрозніваецца ад ранейшых спосабаў. Кампанія «Будзьма», арганізацыя «Арт Сядзіба» ці ініцыятыва «Мова нанова» паспяхова **выкарыстоўваюць розныя формы маркетынгавай камунікацыі**, у аснову якіх пакладзена перакананне, што не «кліент» павінен знайсці «прадаўца» і пераканацца ў патрэбнасці ягонай прапановы, а наадварот: прадавец павінен знайсці і пераканаць кліента. У дадзеным выпадку гэта азначае, што прамотары беларускасці стараюцца прыпаднесці суграмадзянам нацыянальныя каштоўнасці ў такой «упакоўцы» і з такім пасылам, каторы дазволіць «кліентам» адчуць сувязь паміж гэтымі каштоўнасцямі і іх жыццёвымі патрэбамі.

Па-трэцяе, грамадскія акцыі апошняй дэкады па прасоўванні беларускасці **суправаджаліся грунтоўнымі эмпірычнымі даследаваннямі**. У 2009 годзе кансорцыюм Беларускага інстытуту стратэгічных даследаванняў (BISS), лабараторыі «НовАК» і кампаніі «Будзьма» правялі сацыялагічна-культуралагічнае даследаванне стану і тэндэнцыяў развіцця этнічнай ідэнтычнасці беларусаў, а таксама ўплыву, які аказвае гэтае развіццё на дынаміку палітычных і грамадскіх працэсаў у Беларусі. У 2012 годзе былі праведзены аналагічныя даследаванні тымі ж арганізацыямі, але без удзелу BISS. Гэтыя даследаванні былі важным арыентырам для грамадскіх актывістаў – асабліва для каманды «Будзьма» – у іх беларусізацыйнай дзейнасці, дазволілі выбудоўваць дзейнасць з «веданнем рынку»: які на дадзены момант попыт на беларускасць, як яго можна стымуляваць і з дапамогай якіх рэкламных слоганаў можна прыцягваць «кліентаў».

З'яўленне новых метадаў прасоўвання нацыянальных каштоўнасцяў не пазбавіла важнасці ранейшых, больш традыцыйных. Такія інстытуцыі, як «Таварыства беларускай мовы» ці «Саюз беларускіх пісьменнікаў» надалей захоўваюць сваю грамадскую значнасць. Асаблівую ролю ў замацоўванні нацыянальнай тоеснасці адыгрывае каталіцкая царква абодвух абрадаў (рымскага і візантыйскага), якая пасля некаторых ваганняў у 90-ых зрабіла стаўку на беларускую мову як асноўную мову богаслужэнняў і – у большасці выпадкаў – мову справаводства. У часы нунцыятуры мансіньёра Клаўдзія Гуджэроці (2011 – 2015), асабліва ўразлівага да праблемы беларускага нацыянальнага адраджэння, канчаткова замацаваўся кансэнсус наконт ужывання беларускай мовы ў касцёлах.

## Змена стаўлення рэжыму да нацыянальнага адраджэння

У стаўленні рэжыму да нацыянальнага адраджэння **можна выдзеліць тры перыяды**. У другой палове 90-ых дамінавала выразна негатыўнае стаўленне да адраджэнскага руху і ўсяе беларускамоўнай культуры ў цэлым. Незалежнасць Беларусі, хоць на рытарычным узроўні і падкрэслівалася новаабраным прэзідэнтам, не мела тады ключавога значэння для яго палітыкі. Гэта быў час, калі ў народзе была моцная настальгія па Савецкім Саюзе, атачэнне Лукашэнкі не ўяўляла пераадолення эканамічнага крызісу без цеснай інтэграцыі з Расеяй, а сам Лукашэнка спадзяваўся здабыць уладу ў Расеі з дапамогай праекту саюзнай дзяржавы. Ідэя будавання нацыянальнай дзяржавы, на базе самабытнай культуры, была тады непатрэбным, а нават шкодным баластам.

Першая дэкада бягучага стагоддзя – гэта перыяд пошуку «альтэрнатыўнай» нацыянальнай ідэі, такой, якая сцвярджала б беларускую тоеснасць, але пры гэтым была адрознай ад той, якую прасоўвалі адраджэнцы. Галоўным чынам дзеля гэтага ў 2003 годзе была запушчана «ідэалогія беларускай дзяржавы», для распрацоўкі і прапагандавання якой былі заангажаваны дзясяткі навукоўцаў, тысячы чыноўнікаў і мільёны долараў у эквіваленце. Гэта быў час, калі ў звязку з прыходам Пуціна да ўлады спадзяванні Лукашэнкі на ўваход на расейскую палітычную арэну былі зруйнаваны, а ідэя незалежнасці Беларусі набыла ключавое значэнне. Адраджэнская версія нацыянальнай ідэі па-ранейшаму байкатуецца рэжымам, але ранейшы негатывізм да яе паступова слабее, а некаторыя яе элементы ўвабіраюцца дзяржаўнай ідэалогіяй.

Другая дэкада, у якой мы зараз жывем, пазначана чарговымі зменамі ў стаўленні да нацыянальнай ідэі. Смерць у 2011 годзе Якава Трашчанка, аднаго з вядучых ідэолагаў мінулага дзесяцігоддзя, можна лічыць сімвалічным момантам «змены парадыгмы»,

хоць змены пачаліся яшчэ да ягонай смерці, а фактары гэтых зменаў разнастайныя. У чым дакладна палягае змена парадыгмы?

Перадусім **змянілася стаўленне да Полацкага княства**. У першай дэкадзе 21-ага стагоддзя вядучыя дзяржаўныя ідэолагі – палітолаг Уладзімір Мельнік, філосаф Леў Крыштаповіч і гісторык Якаў Трашчанок – памяншалі палітычнае значэнне Полацкага княства (маўляў, гэта было адно з удзельных княстваў тагачаснай Рускай дзяржавы) і не прызнавалі ёй якой-кольвечы культурнай самабытнасці. Цягам 2010-2012 гадоў выйшлі новыя падручнікі па гісторыі Беларусі, у якіх сцвярджаецца як культурная самабытнасць, так і палітычная значнасць Полацкага княства. У 2013 годзе гісторык Мікалай Смяховіч на старонках «Беларускай думкі» заявіў пра паўстанне «новай канцэпцыі гісторыі беларускай дзяржаўнасці». Гэтая «навізна» палягала ў акрэсленні старажытнага Полацка «калыскай» беларускай дзяржаўнасці[1]. Тэза, вядома ж, не была новай, яна даўно бытавала ў адраджэнскім дыскурсе; новым тут было, бадай, прыняцце гэтай тэзы ў афіцыёзную гістарыяграфію. Калі ў 2014 годзе Аляксандр Каваленя падсумоўваў дасягненні Інстытута гісторыі НАН Беларусі з нагоды яго 85-годдзя, то роля Полацкага і Тураўскага княства ў станаўленні беларускай дзяржаўнасці прэзентаваліся як нешта само сабой зразумелае[2].

«Нашай гістарычнай калыскай» назваў Полацкае княства беларускі прэзідэнт у прамове падчас урачыстага сходу 1 ліпеня 2017 года прымеркаванага да Дня Рэспублікі[3]. Гэтая тэза была прыпячатана ўстанаўленнем 2 верасня таго ж года ў Полацку памятнага знаку «Полацк – калыска беларускай дзяржаўнасці». У гэтым жа годзе адбыліся іншыя падзеі, якія паказваюць сур'ёзнасць зменаў у падыходзе да гістарычнага наратыву. На пярэдні план выйшлі два выкладчыкі Полацкага ўніверсітэта – Вольга Ляўко і Дзяніс Дук, гісторыкі, якія паслядоўна адстойваюць тэзу аб «доўгай» гісторыі Беларусі (насуперак тэндэнцыі мінулых перыядаў звязвання выхаду Беларусі на гістарычную сцэну з савецкім перыядам). Полацкае княства ў трактоўцы Ляўко-Дука явіцца як самастойнае, палітычна аформленае і культурна самабытнае дзяржаўнае ўтварэнне, ад якога можна смела весці адлік гісторыі беларускай дзяржаўнасці.

За сваю кнігу «Крыніцы беларускай дзяржаўнасці. Полацкія і віцебскія землі ў IX – XVIII гадах» Вольга Ляўко атрымала дзяржаўную узнагароду, а пра яе працу Аляксандр Лукашэнка выказаўся так: «У ёй належным чынам адлюстравана фармаванне

---

[1] Николай Смехович, *Белорусская государственность: истоки и формы*, «Беларуская думка», 11/2013. С. 81.

[2] Аляксандр Каваленя, *Пачуццё Бацькаўшчыны. Да 85-й гадавіны Інстытута гісторыі Нацыянальнай Акадэміі Навук Беларусі*, «Беларуская думка», 9/2014. С. 26.

[3] *Государство — это мы! Выступление Президента на торжественном собрании, посвященном Дню Независимости Республики Беларусь*, 1 июля 2017 г. «Беларусь сегодня», 4 июля 2017 г. https://www.sb.by/articles/gosudarstvo-eto-my-president-sobranie.html

беларускай дзяржаўнасці. Трэба запісаць і прышчапіць у розумы людзей гэтую ісціну. Можа і ёсць у гэтым нейкі нацыяналізм, але гэта здаровы нацыяналізм»[4]. Варта супаставіць гэтае выказванне прэзідэнта з яго выказваннем у 2014 годзе, калі ён дзяліўся з расейскімі журналістамі думкамі пра змест ідэалогіі (мелася на ўвазе тая, што была распрацавана ў першай дэкадзе стагоддзя): «Спасярод усяго таго, што мне прапанавалі, нейк нішто не прылягло да сэрца»[5]. Выглядае на тое, што «здаровы нацыяналізм», рэпрэзентаваны Ляўко і яе калегамі, нашмат больш даспадобы прэзідэнту, чым русафільскія канцэпцыі ідэолагаў з папярэдняй дэкады.

**Змены ў гістарычным наратыве тычацца таксама ВКЛ, БНР і ролі расейскага фактару**. Ранейшы скептыцызм датычна значэння Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) у беларускай гісторыі паступова ператварыўся ў падкрэсліванне ключавога значэння ВКЛ у фармаванні беларускай нацыі, яе мовы і культуры. Красамоўным сведчаннем гэтаму ёсць тое, што падчас судовага паседжання ў справе аўтараў інтэрнэт-рэсурсу «Regnum», што мела месца ў снежні 2017 года, у спісе пракурорскіх абвінавачанняў з'явілася абвінавачанне ў тым, што той «адмаўляе гістарычную спадчыну ВКЛ»[6]. Але грунт пад такое стаўленне да ВКЛ рыхтаваўся ўжо ад пачатку гэтай дэкады. Падручнікі па гісторыі 2010-2012 гадоў, публікацыі ў вядучых дзяржаўных СМІ, урэшце размашыстае святкаванне 500-годдзя выдання Францішкам Скарынам першага перакладу Бібліі прасоўвалі – хай сабе часам і з агаворкамі – тэзу пра сутнаснае значэнне перыяду ВКЛ у айчыннай гісторыі. «Эпоха ВКЛ для нас – адпраўны пункт нараджэння і існавання ўласна беларускага народа» – пісаў у 2014 годзе Ігар Марзалюк у прэзідэнцкай газеце «Беларусь сегодня»[7].

Ранейшая прывязка беларускай гісторыі да гісторыі Расеі значна паслабілася, а месцамі займела нават формы негатыўнай ацэнкі расейскага фактару. Прыкладам, у жніўні 2014 года «Беларуская думка» апублікавала артыкул прафесара Леаніда Лыча, у якім адназначна крытыкавалася русіфікатарская палітыка Расейскай Імперыі[8].

Грэблівае стаўленне да Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР), якое было характэрнае для папярэдніх перыядаў, цягам гэтай дэкады ператвараецца ў трактаванне яе як важнай спробы беларусаў заявіць пра сябе як пра самастойную нацыю са сваімі

---

4 *Лукашенко: историю становления белорусского государства нужно достоверно отразить в новых учебниках*, http://www.belta.by/president/view/lukashenko-istoriju-stanovlenija-belorusskogo-gosudarstva-nuzhno-dostoverno-otrazit-v-novyh-uchebnikah-235365-2017

5 *Лукашенко: государственную идеологию, которая бы легла на душу, мы так и не изобрели*, «Белорусские новости», 17.10.2014 http://naviny.by/rubrics/politic/2014/10/17/ic_news_112_447175

6 Гэтае абвінавачанне тычылася Юрыя Паўлаўца, рэдактара рэсурсу. Гл.: Алег Груздзіловіч, *У чым пракуратура выявіла распальваньне нацыянальнай варожасьці Паўлаўцом?* 18 снежня 2017 г. https://www.svaboda.org/a/28924491.html

7 Ігар Марзалюк, *А хто там ідзе?* «Беларусь сегодня», 21 июня, 2014 г.

8 Гл. Леанід Лыч, *Духоўны дыямент нацыі*, «Беларуская думка», 8/2014.

палітычнымі амбіцыямі. У траўні 2017 года «Беларусь сегодня» апублікавала артыкул Пятра Краўчанкі, у якім ён падкрэсліваў, што «без БНР не было б БССР»[9]. Праз месяц тая ж самя тэза прасоўвалася ў артыкуле Міхаіла Стральца, апублікаваным у «Народнай газеце»[10].

**Адносна нязменным засталося стаўленне да савецкага перыяду**. Роля Савецкага Саюзу ў здабыцці Беларуссю дзяржаўнасці, сацыяльнай эмансіпацыі беларусаў і эканамічным росквіце ўсцяж моцна падкрэсліваецца ў афіцыйным дыскурсе. Вялікая Айчынная Вайна надалей займае цэнтральнае месца ў  палітыцы памяці. Тым не менш, заангажаванне ўладаў у добраўпарадкаванне мемарыяла «Курапаты» і медыйная падтрымка дзяржаўных СМІ кампаніі па збору сродкаў на гэту мэту даюць падставы спадзявацца, што прынамсі некаторыя аспекты савецкага мінулага будуць перагледжаны. Нагадаем, што ў першы тэрмін прэзідэнтуры Лукашэнкі тэза пра масавыя расстрэлы супрацоўнікамі НКУС у Курапатах прэзентавалася дзяржаўнай прапагандай як выдумка варожых сіл. Асабліва яскрава гэта праявілася ў фільме «Нянавісць. Дзеці хлусні», што дэманстраваўся двойчы на дзяржаўным тэлебачанні непасрэдна перад рэферэндумам, што адбыўся 14 траўня 1995 года. У першай жа дэкадзе гэтага стагоддзя тэма Курапатаў або байкатавалася афіцыйным дыскурсам, або насвятлялася ў духу савецкай прапаганды, і толькі зрэдку з'яўляліся спробы «глянуць інакш» на гэту тэму. Цяпер стаўленне ўладаў да «Курапатаў» дыяметральна розніцца ад таго, што дамінавала ў другой палове 90-ых, і выразна адрозніваецца ад таго, што было ў першай дэкадзе гэтага стагоддзя.

Змянілася моўная палітыка. У папярэднія два перыяды яна характарызавалася двайной тактыкай: 1) нефармальнае выцясненне беларускай мовы з публічнай прасторы, спалучанае з падрымліваннем стэрэатыпу пра «няразвітасць» гэтай мовы; 2) стасаванне ліберальнай рыторыкі ў адказ на любы закід занядбоўвання мовы або парушэння правоў беларускамоўных: маўляў, у нас свабода выбару мовы зносінаў, і калі большасць жадае камунікаваць па-расейску, то трэба ўшанаваць гэты выбар. Бывалі рэдкія і ізаляваныя выпадкі выказванняў топ-чыноўнікаў на карысць беларускай мовы, але яны заглушаліся больш частымі і больш уплывовымі выказваннямі наконт «недаразвітасці» гэтай мовы, прынамсі ў яе супастаўленні з расейскай.

Цягам бягучай дэкады **падкрэсліванне важнасці захавання роднай мовы стала абавязковай нормай**. Хоць радыкальных зрухаў у напрамку пашырэння мовы не адбываецца (у сферы адукацыі, асабліва вышэйшай, усцяж дамінуе расейская мова,

[9] Пётр Краўчанка, *Погляд у будучыню. У пошуках нацыянальнай ідэі*, «Беларусь сегодня», 30 мая 2017 г. https://www.sb.by/articles/poglyad-u-buduchynyu-u-poshukakh-natsyyanalnay-idei.html

[10] Міхаіл Стралец, *Тое, што нас аб'ядноўвае. У чым сутнасць нацыянальнай ідэі*, „Народная газета", 30 июня 2017 https://www.sb.by/articles/toe-shto-nas-ab-yadno-vae.html

справаводства надалей вядзецца па-расейску, абсалютная большыня чыноўнікаў камунікуе па-расейску), то ўсё ж відавочна тое, што беларускія ўлады актыўна прасоўваюць *іншае стаўленне* да беларускай мовы. У красавіку 2014 года ў сваім Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Калі перастанем размаўляць па-беларуску, перастанем быць нацыяй». У гэтым жа пасланні ён самакрытычна сцвердзіў: «Відавочна, маюць рацыю тыя, хто крытыкуюць мяне за занядбоўванне [беларускай] мовы»[11]. У студзені 2015 года, падчас чарговага з'езду БРСМ, Лукашэнка падкрэсліў нацыятворчую ролю нацыянальнай культуры, у прыватнасці «літаратуры, мовы і каштоўнасцяў[12].

На іншых узроўнях вертыкалі таксама гучаць напаміны аб важнасці захавання беларускай мовы. «Будзе жахліва, калі мы страцім мову» – казаў увосень 2014 года тагачасны віцэ-прэм'ер Анатоль Тозік[13]. Ігар Бузоўскі, тагачасны намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, у 2015 годзе заявіў: «Мову, культуру, пісьменства можна назваць ахоўнай граматай беларускай дзяржаўнасці»[14]. «Лёс мовы павінен стаць агульным клопатам для ўсяго грамадства» – такім быў галоўны пасыл удзельнікаў дыскусіі, што зладзіла рэдакцыя «Беларусь сегодня» ў лістападзе 2017 года[15].

**Бягучая дэкада – гэта перыяд моцнага наступу абаронцаў беларускай мовы**, які не толькі не стрымліваецца ўладамі, але і падтрымліваецца. Гэты наступ вядзецца ў розных формах – ад арганізоўвання курсаў беларускай мовы, цераз салідарны выступ у абарону мову ў сацыяльных сетках і заканчваючы судовымі працэсамі супраць тых, хто парушае правы беларускамоўных. Ад 2013 года датуем выпадкі, калі абаронцы мовы знаходзяць пазітыўны водгук у дзяржаўных органах у сваіх намаганнях па прыцягненні да адміністрацыйнай ці дысцыплінарнай адказнасці асоб, што дазволілі сабе ў той ці іншай форме выказаць непавагу да беларускай мове. У верасні 2013 года Суд Фрунзенскага раёна Мінска аштрафаваў дырэктара мінскага ЖЭС-48 за адмову адказаць на зварот па-беларуску. У студзені 2017 года былы супрацоўнік МУС Васіль Варушчанка быў праз суд пакараны за абразу беларускай мовы. У лютым таго ж года ў Рэчыцах па той жа прычыне была пакарана юрыстка Яўгенія Чацвяртная. Аргумент сп. Чацвяртной, што выказванне пра мову было «прыватным меркаваннем», у дадзеным выпадку не быў успрыняты ідэолагамі і

[11] *Послание Президента Республики Беларусь А.Г.Лукашенко белорусскому народу и Национальному собранию Республики Беларусь «Сильная экономика и честная власть – фундамент независимости страны и процветания нации»*, 22.04.2014, http://pravo.by/document/?guid=3871&p0=P014p0001

[12] *Лукашенко: национальная культура, язык и история делают белоруса белорусом, а не просто "тутэйшым"*, „БелТА" 20 января 2015 г. http://www.belta.by/ru/video/i_3502.html

[13] *Тозік: Гэта будзе жахліва, калі мы страцім мову*, «Наша Ніва», 17.10.2014 https://nn.by/?c=ar&i=137241

[14] *Бузоўскі: мову, культуру, пісьменства можна назваць ахоўнай граматай беларускай дзяржаўнасці*, «БЕЛТА», 07.09.2015 http://blr.belta.by/culture/view/buzouski-movu-kulturu-pismenstva-mozhna-nazvats-ahounaj-gramataj-belaruskaj-dzjarzhaunastsi-37096-2015/

[15] *Жывая спадчына*, «Беларусь сегодня», 11 ноября 2017 г. https://www.sb.by/articles/zhyvaya-spadchyna.html

пракурорам як рэлевантны.

Змянілася стаўленне да інстытутаў і сімвалаў, якія акцэнтуюць беларускую самабытнасць. **Беларускія ўлады пачалі наладжваць адносіны з беларускай дыяспарай**. У 2014 годзе быў прыняты закон «Аб беларусах замежжа», які мае невялікае практычнае значэнне[16], але змяшчае акрэслены ідэалагічны пасыл. Артыкул 2. прасоўвае ідэю будавання панадтэрыятарыяльнай нацыянальнай супольнасці на культурнай аснове. Спасярод розных канцэпцый нацыянальнай тоеснасці – грамадзянская, палітычная, этнакультурная – у аснову законапраека была пакладзена этнакультурная канцэпцыя, гзн. тая, што акцэнтуе моўна-культурную самабытнасць як аснову нацыянальнай тоеснасці. Артыкул 14. абавязаў Міністэрства Замежных Спраў утварыць Кансультацыйную раду што і было незадоўга зроблена. Хоць Кансультацыйная рада не дужа рэпрэзентатыўная (дамінуюць там рэкамендаваныя беларускімі пасольствамі асобы)[17], то ўсё ж сам факт паўстання такой пляцоўкі сведчыць пра жаданне ўладаў знайсці новыя формы ўзаемадзеяння з дыяспарай.

Беларускія ўлады актыўна заангажаваліся ў прасоўванне «вышыванкі», якая ўтварае адзін з найважнейшых атрыбутаў несавецкай нацыянальнай культуры. **Стаўленне ўладаў да бел-чырвона-белага сцяга па-ранейшаму застаецца халодным, але і тут можна казаць пра сімптомы змены пазіцыі**. 13 чэрвеня 2017 года Ліберальна-дэмакратычная партыя Беларусі (ЛДПБ) выдала заяву, у якой заклікае да прызнання гэтых сімвалаў гістарычна-культурнай каштоўнасцю[18]. Такога тыпу заклікі рабіліся living рознымі грамадскімі суб'ектамі і раней (у 2008 і 2010 гадах – партыяй «Беларускага народнага фронту», у 2013 – Арт-Сядзібай), але зварот ЛДПБ цікавы тым, што ён упершыню быў агучаны кімсьці, хто не толькі не быў раней абаронцам нацыянальных каштоўнасцяў, але і функцыянаваў у іншай палітычнай плашчыні, чым традыцыйная апазіцыя. ЛДПБ паўстала ў другой палове 90-ых як філіял аднайменнай партыі Уладзіміра Жырыноўскага, а значная частка яе гісторыі пазначана змаганнем за беларуска-расейскае адзінства. Апроч таго, гэтая партыя, хоць і характарызуецца пэўнай аўтаноміяй, то па вялікім рахунку функцыянуе як інструмент беларускіх уладаў, з дапамогай якога ўтрымліваецца бачнасць плюралізму і альтэрнатыўнасці ўнутры сістэмы. Такім чынам, чэрвеньскую заяву ЛДПБ выпадае ўспрымаць як нешта большае, чым спроба абнаўлення свайго палітычнага іміджу. Цалкам магчыма, што гэта элемент падрыхтоўкі грамадства да рэабілітацыі сцяга.

---

[16] Ігар Губарэвіч, старэйшы аналітык Цэнтра Астрагорскага, які шмат гадоў прапрацаваў у МЗС Беларусі звяртае ўвагу на тое, што закон не прапануе афіцыйнага прызнання статусу беларусаў замежжа, не прадугледжвае ніякіх стымулаў вяртання ў Беларусь або інвеставання ў ёй, гл. *Няпростыя стасункі МЗС Беларусі і дыяспары*, «Цэнтр Астрагорскага», 17.09.2016 http://ostro.by/politics/nyaprostyya-stasunki-mzs-belarusi-i-dyyaspary/

[17] Тамсама.

[18] *ЛДП заклікае легалізаваць бел-чырвона-белы сцяг і «Пагоню»*, http://belsat.eu/news/ldp-zaklikae-legalizavats-bel-chyrvona-bely-stsyag-i-pagonyu/

## II. Чым абумоўлены і наколькі глыбокія названыя трэнды?

Віталь Сіліцкі канстатаваў у 2009 годзе **«пераходны вакуум» у свядомасці беларусаў**: яны пазбыліся шэрагу асацыяцый, якія замінали ім думаць аб сабе ў катэгорыях асобнай нацыі (савецкасць, рускасць, тутэйшасць), але гэтае месца ў іх свядомасці ўсцяж незапоўненае. Пераважная бальшыня беларусаў з лёгкасцю ідэнтыфікуе сябе як асобную нацыі, але мае цяжкасці з вытлумачэннем, у чым гэта асобнасць (адметнасць) палягае. Свядомасць таго, што гэты «вакуум» патрэбна запоўніць якасным і трывалым зместам, можна лічыць галоўным фактарам рознага роду нізавых ініцыятыў, прадпрыманых як грамадскімі актывістамі, так і прадстаўнікамі бізнэсу. Агрэсіўная палітыка Расеі ў рэгіёне яшчэ больш мабілізуе гэтых актывістаў да ўмацоўвання нацыянальнай тоеснасці ў сваіх суграмадзянаў.

У выпадку бізнэсу матывацыйная структура часткова супадае, а часткова адрозніваецца ад той, якая характарызуе грамадскіх актывістаў. Пачуццё культурнай або грамадзянскай місіі бізнэсоўцам не чужое, аднак далёка не заўсёды яна іграе галоўную ролю пры выкарыстанні або прасоўванні нацыянальных элементаў. Існуюць як мінімум дзве чыста прагматычныя прычыны, па якіх бізнэс схільны звяртацца да беларускасці, першая рэлевантная для любога бізнэсу, другая – для айчыннага. Першая: многія **бізнэсоўцы даволі хутка заўважылі, што рэкламаванне на беларускай мове валодае немалым перцэпцыйным козырам**: яна дастаткова зразумелая для насельніцтва, каб з яе дапамогай данесці нейкі пасыл, а пры гэтым дастаткова экзатычная, каб рэклама на гэтай мове выдзялялася на фоне агульнага інфармацыйнага патоку і прыцягвала ўвагу. Другая: **айчыныя вытворцы маюць свядомасць таго, што моцная нацыянальная тоеснасць – гэта хаўруснік выгадных для іх спажывецкіх установак**: чым мацнейшая гэта тоеснасць, тым большая верагоднасць, што беларускі пакупнік аддасць перавагу айчыннаму тавару.

Цяпер пяройдзем да высвятлення трэндаў, што былі выяўлены ў дзяржаўнай палітыцы. Усе названыя вышэй трэнды – у гістарычным наратыве, моўнай палітыцы і стаўленні да нацыянальных сімвалаў – даюць падставы казаць пра паступовую змену парадыгмы ў дачыненні да нацыянальнай ідэнтычнасці; папулярны назоў «мяккая беларусізацыя» тут цалкам да месца. Пытанне: Чаму такая змена пачала адбывацца?

Важным фактарам гэтага працэсу сталі – зноў жа – падзеі ва Украіне (анэксія Расеяй Крыма і прарасейскі сепаратызм на ўсходзе Украіны). Менавіта пасля гэтых падзеяў, гзн. ад 2014 года заўважаем найбольш выразныя захады ў напрамку ўмацоўвання

нацыянальнай тоеснасці беларусаў. Няцяжка здагадацца, чаму ўкраінскія падзеі адыгралі тут вялікую ролю: яны вельмі наглядна паказалі Лукашэнку і яго акружэнню безабароннасць іхняга рэжыму ў дачыненнях з магутным суседам. Адсутнасць моцнай нацыянальнай тоеснасці беларусаў чыніць іх лёгкай здабычай расейскай прапаганды.

Дзеянні Расеі адносна Украіны, бясспрэчна, аказалі моцны ўплыў на рэжым Лукашэнкі ў плане стаўлення да нацыянальнай тоеснасці, але гэта быў далёка не адзіны (і храналагічна не першы) фактар. Варта тут прыгадаць, што, хоць найбольш выразныя зрухі ў напрамку беларусізацыі пачалі адбывацца з вясны 2014 года, то ўсё ж некаторыя крокі ў гэтым напрамку мелі месца раней: падручнікі, у якіх гісторыя Беларусі была адасоблена ад гісторыі Расеі, выйшлі ў 2010-2012 гг., а ў верасні 2013 года быў першы выпадак, калі чыноўнік быў аштрафаваны за нежаданне даць пісьмовы адказ на беларускай мове.

**Мяккая беларусізацыя з боку дзяржавы – гэта вынік акумулятыўнага ўздзеяння шматлікіх фактараў**, як вонкавых, так і ўнутраных. Асноўныя перадпасылкі для звароту ў накірунку ўмацоўвання нацыянальнай тоеснасці з'явіліся ўжо на пачатку мінулай дэкады. Падчас як у часы Барыса Ельцына, хворага і вельмі непапулярнага сярод расейскіх патрыётаў, Лукашэнку лёгка было будаваць імідж ахоўніка «рускага міру», то пасля прыходу да ўлады Уладзіміра Пуціна гэта стала ўжо немагчымым. Пуцін вельмі хутка заваяваў давер расейскіх патрыётаў і Лукашэнка мог разлічваць у лепшым выпадку на быццё правінцыйным памагатым крамлёўскага лідэра. Беларускі прэзідэнт мусіў таксама развітацца з надзеяй на здабыццё рэальнай улады ў Расеі, якую ён меў (і небеспадстаўна) у другой палове 90-ых. У гэтай сітуацыі лагічным было зрабіць стаўку на ўмацаванне сваёй улады ўнутры самой Беларусі, што азначала між іншым прадпрыняцце крокаў у накірунку змяншэння магчымасцяў уплыву Расеі. Паколькі было ясна, што ў эканамічным, асабліва ў энэргетычным, плане Беларусь яшчэ доўга застанецца залежнай ад Расеі, Лукашэнка засяродзіўся перадусім на кадравай палітыцы (паступовае адхіленне ад ключавых пасад асоб, якія падазраваліся ў празмернай лаяльнасці да Расеі) і стварэнні тзв. ідэалогіі беларускай дзяржавы.

Тэарэтычна «мяккая беларусізацыя» магла распачацца ўжо 2002 або 2003 годзе, бо ўжо тады паўсталі дзеля гэтага дзве сур'ёзныя перадпасылкі. Па-першае, Лукашэнка ўжо тады быў персанальна зацікаўлены ў тым, каб ідэя незалежнасці Беларусі стала галоўным імператывам для кожнага грамадзяніна, асабліва для чынавенства. Лаяльнасць да Беларусі – гэта хоць не дастатковая, але неабходная ўмова лаяльнасці да ягонай улады. Па-другое, Лукашэнка з'яўляецца дастаткова цвярозым палітыкам, каб разумець, што існуе лаяльнасць глыбокая, прадыктаваная ўнутраным перакананнем (і яна трывалая), і існуе паказная лаяльнасць, якая хутка і лёгка знікае. Гыбокая ж лаяльнасць абапіраецца на нейкую сістэму каштоўнасцяў.

Натуральнай каштоўнаснай базай для прасоўвання імператыву незалежнасці Беларусі мог стаць адраджэнскі дыскурс, які быў ужо праверany часам, валодаў немалым мабілізацыйным патэнцыялам і быў афармлены ў даволі звязную і паслядоўную сістэму ідэй. Чаму ён не быў узяты на ўзбраенне ўжо пятнаццаць год таму?

Па-першае, ужо былі спалены некаторыя масты паміж Лукашэнкам і адраджэнскім рухам, адбудаваць якія вельмі хутка не было магчымым. Маецца на ўвазе перадусім рэферэндум 1995 года, калі на месца гістарычных, дасавецкіх сімвалаў (бел-чырвона-белы сцяг і герб «Пагоня») былі вернуты сімвалы БССР (злёгку відазмененыя) у якасці дзяржаўных. Палітыка беларусізацыі, што мела месца ў першай палове 90-ых, была Лукашэнкам згорнута амаль адразу пасля яго прыходу да ўлады ў 1994 годзе. Таму, калі б беларускі лідэр распачаў якую-кольвечы беларусізацыю на пачатку нулявых, то нацыянальная апазіцыя хутчэй паспрабавала б выкарыстаць гэта супраць ягонага рэжыму, чым падтрымала б яго. Па-другое, у самога Лукашэнкі была яшчэ зусім свежай памяць пра жорсткія баталіі з Беларускім народным фронтам (БНФ), асабліва яго першым лідэрам Зянонам Пазьняком. Па-трэцяе, яшчэ з часоў першай перадвыбарчай кампаніі Лукашэнкі яго электаральнай апорай была тая частка насельніцтва, што характарызавалася моцнай настальгіяй па Савецкім Саюзе, і якая магла б быць дэзарыентавана, калі б ужо ў нулявыя гады Лукашэнка распачаў якую-кольвечы заўважную беларусізацыю. Дадаць варта, што атачэнне Лукашэнкі на той час таксама складалася пераважна з асоб, для якіх СССР быў ментальна і псіхалагічна блізкім і якія былі прыхільнікамі як мага больш шчыльнай інтэграцыі з Расеяй. Па-чацвёртае, хоць на пачатку нулявых Лукашэнка развітаўся з ідэяй здабыцця ўлады ў Расеі, то ўсё ж шчыра разлічваў на куплянне ў Расеі нафты і газу па расейскіх унутраных цэнах узамен за падтрымліванне ў Беларусі русафільскай атмасферы.

**Увядзенне ідэалогіі беларускай дзяржавы ў 2003 годзе – гэта своеасаблівы адказ на галаваломнае пытанне: Як будаваць беларускую незалежнасць, але пры гэтым трымаць здалёк ад гэтага працэсу адраджэнцаў** і выглядаць у вачах расейскіх патрыётаў лаяльным сябрам «рускага міру»? Дзяржаўная ідэалогія паклікана была распрацаваць такую нацыянальную ідэю, якая, з аднаго боку, абгрунтуе і замацуе курс на незалежнасць, а з другога – будзе альтэрнатыўнай у стасунку да таго, што прапанавалі адраджэнцы. Нягледзячы на тое, што да распрацоўкі такой ідэі былі прыцягнуты вядучыя спецыялісты ў галіне грамадскіх навук, рэгулярна выдзяляліся вялікія фінансавыя сродкі і была створана разгалінаваная «ідэалагічная вертыкаль», пераканаўчая альтэрнатыва не была вынайдзена, што ў пэўны момант прызнаў сам Лукашэнка[19].

[19] Гл. цытаваны вышэй тэкст *Лукашенко: государственную идеологию, которая бы легла на душу, мы так и не изобрели*, «Белорусские новости», 17.10.2014 http://naviny.by/rubrics/politic/2014/10/17/ic_news_112_447175

Цягам мінулага дзесяцігоддзя дзейнічалі розныя іншыя фактары, якія паступова прывялі Лукашэнку і яго атачэнне да перагляду свайго стаўлення да адраджэнскай нацыянальнай ідэі, а прынамсі некаторых яе аспектаў. Асаблівай увагі заслугоўваюць наступныя фактары: а) нарастанне эканамічнага і інфармацыйнага ціску на Лукашэнку з боку Расеі; б) прыклад іншых постсавецкіх аўтарытарных лідэраў у справе ўмацоўвання нацыянальнай тоеснасці; в) частковая дэпалітызацыя адраджэнскага дыскурсу; г) Лукашэнка і яго атачэнне заўважылі, што зварот да нацыянальных каштоўнасцяў дае пэўныя іміджавыя выгады ў дачыненнях з Захадам. Коратка патлумачым рэлевантнасць гэтых фактараў.

**А**. Пачынаючы з 2002 года, Крэмль пачынае весці даволі жорсткую палітыку ў дачыненні да беларускага рэжыму, якая ў доўгатэрміновай перспектыве павінна была прывесці да здабыцця поўнага эканамічнага і палітычнага кантролю над Беларуссю. Ужо самі «газавыя» і «малочныя войны», якія рэгулярна ўспыхвалі паміж Расеяй і Беларуссю, прымушалі Лукашэнку ўсур'ёз паставіцца да фундаментаў беларускай незалежнасці. Ваенная інтэрвенцыя Расеі ў Грузіі ў жніўні 2008 года, а таксама ўдзел Расеі ў звяржэнні кіргізскага прэзідэнта Курманбека Бакіева ў красавіку 2010 года паказалі, наколькі далёка Крэмль гатоў пайсці дзеля аднаўлення сваёй імперскай пазіцыі ў рэгіёне. Інфармацыйная вайна супраць Лукашэнкі, што была распачата тэлеканаламі НТВ і Russia Today у ліпені 2010 года[20] (незадоўга пасля звяржэння Бакіева і незадоўга да прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі) цалкам пазбавілі Лукашэнку ілюзій наконт надзейнасці расейскай падтрымкі ў захаванні ягонай улады ў Беларусі. **Агрэсія Расеі супраць Украіны ў 2014 годзе абвастрыла свядомасць патэнцыйнай пагрозы з боку Расеі, але не яна была «момантам прабуджэння»**. **Прабуджэнне наступіла значна раней.**

**Б**. Тое, што фактычна ўсе лідэры постсавецкіх краін праводзілі палітыку умацоўвання нацыянальнай тоеснасці (у мяккай ці цвёрдай форме) не магло застацца незаўважаным з боку Лукашэнкі. Беларускі лідэр бачыў, што курс на нацыянальнае адраджэнне бяруць не толькі празаходнія і дэмакратычныя краіны, як напр. краіны Прыбалтыкі, але таксама краіны аўтарытарныя і далёкія ад еўрапейскіх каштоўнасцяў, такія як Казахстан ці Туркменістан. Прыклад гэтых апошніх, з лідэрамі якіх Лукашэнка падтрымліваў сталыя кантакты і якія былі яму блізкія па духу і ментальнасці, паказваў, што **нацыяналізм не толькі не мусіць пагражаць аўтарытарнай сістэме, але можа даваць ёй дадатковую падстрахоўку**. Па меры аддалення ад савецкай эпохі і расчаравання расейскім братэрствам, менавіта нацыянальная ідэалогія – з яе стаўкай на мову, гістарычны наратыў і культурную самабытнасць – пачала ўспрымацца Лукашэнкам як цалкам добрае апірышча для персанальнай улады.

[20] Маецца на ўвазе серыял «Крёстный батька», што паказваўся на НТВ з ліпеня 2010 па чэрвень 2011 года і "Hard Luca", што выйшаў на Russia Today 4 ліпеня 2010 года.

**В**. Калі Лукашэнка на пачатку 2011 года распачаў свой чацвёрты прэзідэнцкі тэрмін, то даўнія баталіі з БНФ і роднаснымі яму палітычнымі сіламі былі ўжо бляклым успамінам. Зніклі многія псіхалагічныя бар'еры перад новым спаглядам на ідэю беларусізацыі грамадства.

Паралельна адбывалася спантанная дэпалітызацыя нацыянальных каштоўнасцяў. Беларуская мова паступова перастала асацыявацца ў грамадстве з апазіцыйнай дзейнасцю, а цікавасць да нацыянальнай гісторыі ахоплівала самыя розныя сегменты грамадства. Заангажаванне бізнэсу, грамадскіх актывістаў (часам далёкіх ад палітыкі), навукоўцаў, а таксама каталіцкай царквы ў прасоўванне беларускай мовы і культуры паспрыяла іх адасабленню ад «бээнэфаўскай» палітычнай праграмы. Нельга забываць таксама, што **ўнутры самога рэжыму заўсёды былі прыхільнікі беларускага адраджэння**. У перыяд інтэнсіўнага беларуска-расейскага сяброўства яны былі пазбаўлены права голасу, але па меры пагаршэння адносін з Расеяй да іх меркавання беларускія палітыкатворцы пачалі больш і больш прыслухоўвацца.

**Г**. Хоць нацыянальнае адраджэнне ў постсавецкіх краінах ніколі не было для Захада галоўным прыярытэтам, то ўсё ж яго наяўнасць або адсутнасць мае сваё значэнне. Заходнікі ведаюць, якую ролю ў працэсе пераадолення аўтарытарызму адыгралі нацыянальныя пачуцці ў такіх краінах, як Польшча, Літва, Латвія ці Эстонія, таму – пры ўсіх засцярогах да нацыяналізму – успрымаюць памяркоўны курс на нацыянальнае адраджэнне як станоўчую з'яву. У сітуацыі, калі ў беларускага рэжыму вельмі абмежаваны запас магчымасцяў зрабіць добрае ўражанне на еўрапейцах, курс на мяккую беларусізацыю можа быць таксама адным з элементаў будавання рэжымам станоўчага іміджу ў дачыненнях з заходнімі краінамі.

## III. Высновы і прагнозы

Пасля з'яўлення другой часткі даследавання будуць прадстаўлены сінтэтычныя высновы, абапертыя на аналізе абодвух працэсаў – беларусізацыі і лібералізацыі. Тым не менш, з увагі на шматаспектнасць разгляданай у гэтай частцы тэмы, выпадае яе падагульніць ужо на гэтым этапе.

1. **«Мяккая беларусізацыя» - гэта вынік незапланаванай канвергенцыі дзеянняў трох тыпаў актораў: грамадскіх актывістаў, бізнэсу і ўласна беларускай улады**. Матывы дзеянняў у кожнага з гэтых актораў могуць быць розныя, але эфект тут збежны. Паколькі названы працэс – рэзультат дзеянняў не толькі ўладаў, але і іншых суб'ектаў, некаторыя назіральнікі схільны паддаваць крытыцы само паняцце *палітыкі*

*беларусізацыі*: маўляў, тут справа не ў тым, што сама ўлада нешта ў гэтым напрамку робіць, а толькі ў тым, што яна занадта не перашкаджае іншым нешта рабіць. Вось жа наша даследаванне паказвае, што ўлады насамрэч прадпрымаюць актыўныя крокі ў напрамку пашырэння нацыянальных каштоўнасцяў, а таксама ўплываюць на форму і абсяг гэтага працэсу. Адзначым пры гэтым, што вядзенне палітыкі – гэта не толькі калі палітычны суб'ект наўпрост прасоўвае свае інтарэсы, але таксама калі ўмее каналізаваць энэргію іншых суб'ектаў у патрэбным для сябе напрамку. Менавіта гэта – на нашу думку – і робіць улада, калі дае дае большую свабоду дзеяння грамадскім актывістам і палітыкам, якія змагаюцца за беларускае адраджэнне.

2. Мяккая беларусізацыя – гэта прадукт акумуляцыі разнастайных фактараў, якія дзейнічалі на працягу доўгага часу. «Украінскі» фактар тут, безумоўна, іграе важную ролю, але памылковым было б чыніць яго галоўным, а тым больш адзіным. Паколькі гэты працэс выспяваў доўга, можна з высокай дозай упэўненасці сказаць, што ён не з'яўляецца эфемерным або чыста выпадковым працэсам. **Дынаміка беларусізацыі, хутчэй за ўсё, будзе мяняцца, але сам працэс будзе працягвацца.**

3. Абмяркоўваны тут працэс мае таксама свае межы. Па-першае, не выпадае чакаць, што ён ператворыцца ў поўнамаштабную і інтэнсіўную (то бок «цвёрдую») беларусізацыю. Цалкам магчыма, што бел-чырвона-белы сцяг будзе прызнаны гісторыка-культурнай каштоўнасцю, але мала імаверна, што пры Лукашэнку адбудзецца вяртанне бел-чырвона-белага сцяга і герба «Пагоня» ў якасці дзяржаўных сімвалаў. Расейская мова застанецца адной з дзяржаўных моў і будзе дамінаўнай у публічнай прасторы. Па-другое, **мала імаверна, што беларусізацыя калі-кольвечы стане для Лукашэнкі самастойнай каштоўнасцю**, гзн. нечым большым, чым інструментам дасягнення іншых мэтаў (перадусім умацавання сваёй улады). Нацыянальныя, гэтаксама як і заходнееўрапейскія каштоўнасці – гэта для яго «замежная мова», далёкая ад той, да якой ён прывык у савецкія часы і з якой пачуваецца камфортна. Будучы таленавітым палітыкам, ён здольны заўважыць і дацаніць інструментальную вартасць нацыянальнага адраджэння, але сам ён наўрад ці стане яго шчырым прыхільнікам. Па-трэцяе, **мала таксама імаверна, што ідэйны хаўрус з адраджэнскім рухам ператворыцца ў палітычны хаўрус**. Гэта значыць, не выпадае спадзявацца, што прадстаўнікі такіх палітычных сілаў, як БНФ ці КХП будуць дапушчаны на міністэрскія пасады ці якія-небудзь пасады ў Адміністрацыі Прэзідэнта.

Прагнозы, сфармуляваныя ў пункце 2. і 3., як і любыя паліталагічныя прагнозы, патрабуюць клаўзулы «хіба што», бо грамадска-палітычная сфера не падпарадкоўваецца жалезным законам. Першая клаўзула гучыць так: *хіба што займее месца рэальная пагроза агрэсіі з боку Расеі, параўнальная да той, што мела месца ў дачыненні да Украіны*. Адназначна прадбачыць паводзіны Лукашэнкі на такі

выпадак немагчыма, але трэба спадзявацца аднаго з двух: альбо мяккая беларусізацыя будзе цалкам згорнута і адбудзецца вяртанне да радыкальнай вернасці «рускаму міру», альбо рэжым пойдзе на палітычны хаўрус з адраджэнскімі (і заадно праеўрапейскімі) сіламі і пяройдзе да «цвёрдай беларусізацыі».

Другая клаўзула наступная: *хіба што палітычна-эканамічная лібералізацыя зойдзе так далёка, што зменяцца правілы палітычнай гульні*. Інакш кажучы, калі ўсё ж паўстане ў Беларусі нейкая форма гібрыднага рэжыму, то тады працэс беларусізацыі будзе залежаць ад сутнасна новай палітычнай сітуацыі. Але рэлевантнасць такой клаўзулы залежыць ад пытання, наколькі абгрунтаванай ёсць тэза пра лібералізацыю і ці валодае яна якім-кольвечы трансфармацыйным патэнцыялам.

*Дзякуем за прачытанне тэксту.*
*Будзем удзячны за водгукі, якія просім дасылаць на info@belinstitute.eu або/і пакідаць у фэйсбуку ці твітары*

Сацыяльна-палітычныя даследаванні – гэта люстэрка грамадства. Дзякуючы яму мы можам арыентавацца ў часе і прасторы.
Без такога люстэрка людзі становяцца ахвярамі стэрэатыпаў, прапаганды і маніпуляцыі.
**Падтрымайце даследаванні BISS**